всего это было связано или с теми переживаниями и трудностями, которые пришлось ему перенести в столь далёком и рискованном путешествии, или с тем, что себежские крестьяне так и не дождались обещанного для посева зерна, что подрывало авторитет новой власти в глазах местного населения. Как бы то ни было, Первая мировая война подходила к концу. В один прекрасный день себежские пограничники и командование красноармейских частей в районе демаркационной линии обнаружили, что противник в полной тишине, скрытно покинул линию фронта, оставив после себя вконец разоренную территорию. На очередном заседании Себежского уисполкома рабочих, крестьянский, солдатских и батрацких депутатов было объявлено, что 15 ноября 1918 г. с 12 часов дня в Себеже и Себежском уезде снимается военное положение [13, л. 142], но « продовольственный вопрос – вопрос самый жгучий и самый трудный остается и необходимо все имеющиеся силы бросить на это дело» [14, л. 121] . В связи с этим в уезде вводится монополия на хлеб, предпринимаются самые крайние меры против кулаков. Вводится учёт всего оставшегося в уезде хлеба и распределение его между всеми, не эксплуатирующими чужой труд. Большие надежды на преодоление голода на селе возлагаются на комитеты деревенской бедноты. Неимоверными усилиями всех сторон, заинтересованных в преодолении продовольственного кризиса в Витебской губернии и её уездах, к 1921 г. голод отступает, продовольственная проблем несколько смягчается.

**Источники и литература**


1. Псковская энциклопедия. – Псков, 2007. – С. 144-145.
2. Отделение ГКУ ПО «Государственный архив Псковской области» в г. Великие Луки (ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки). Ф. Р. -111. Декреты Совета народных комиссаров, циркуляры, инструкции Витебского губисполкома, постановления и резолюции 2-го съезда и переписка с ним. 11 января 1918 г. – 17 января 1918 г. Оп. 1. Д. 1 Л. 237
3. ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки. Ф. Р.-111. Оп. 1. Д. 8. Л. 1-1об.
4. ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки Ф. Р.-111. Оп. 1. Д. 5. Л. 61.
5. ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки Ф. Р.-111. Оп. 1. Д. 5. Л. 127-127об.
6. ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки Ф. Р.-111. Оп. 1. Д. 8. Л. 1-1об.
7. ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки Ф. Р.-111. Оп. 1. Д. 8. Л. 2-2об.
8. ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки Ф. Р.-111. Оп. 1. Д. 8. Л. 31об.
9. ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки Ф. Р.-111. Оп. 1. Д. 8. Л. 59-59об.
10. ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки Ф. Р.-111. Оп. Ф. Р. – 111. Оп. 1. Д.1 Л. 176.
11. ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки Ф. Р.-111. Оп. Ф. Р. – 111. Оп. 1. Д. 1. Л. 177 – 178.
12. ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки Ф. Р.-111. Оп. Ф. Р. – 111. Оп. 1. Д. 5. Л. 117-117об.
13. ОГКУ ПО ГАПО в г. Великие Луки Ф. Р.-111. Оп. Ф. Р. – 111. Оп. 1. Д. 5. Л. 142.


## ПРАФСАЮЗЫ ВІЦЕБСКА Ў РЭВАЛЮЦЫІ 1917-ГА


***В.У. Акуневіч***

*Віцебск, УА ФПБ «Міжнародны ўніверсітэт "МІТСО"», Віцебскі філіял*


Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, якая адбылася ва ўмовах усегульнага крызісу і першай сусветнай вайны аказалася няздольнай вырашыць наспеўшыя сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і нацыянальныя праблемы. Наадварот, пагаршалася становішча з харчаваннем, раслі цэны на жыццёванеабходныя прадукты, узмацнялася разруха на транспарце, у прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Фабрыканты і заводчыкі намагаліся пераадолець крызіс за кошт рабочых. На фабрыках табачнай Калбаноўскіх і "Дзвіна", сапожных майстэрнях і іншых прадпры-

Репозиторий ВГУ

емствах працяглась рабочага дня была 11-12 гадзін і больш. А рабочыя шчацінна-шчотачнай фабрыкі купца Сабалевіча ўвогуле не мелі нарміраванага рабочага дня. Жахлівымі былі ўмовы працырабочых, асабліва ў пральных і фарбавальных майстэрнях, дзе рабочыя працавалі ў паўпадвальных памяшканнях без вентыляцыі, з выкарыстаннем хімічных рэчываў, у антысанітарных умовах. Нярэдка прымянялася праца жанчын і дзяцей. Заработная плата не паспявала за ростам дарагоўлі на прадукты харчавання і асноўныя прадметы спажывання [4, 16 июня]. Такім чынам становішча рабочых не толькі не змянілася ў параўнані з дарэвалюцыйным перыядам, а нават пагоршылася ва ўмовах крызісу.

Працоўныя чакалі, што Часовы ўрад вырашыць пытанні аб устанаўленні 8-гадзіннага рабочага дня, паляпшэння ўмоў працы і павышэння заработнай платы. Аднак ён нічога не прадпрымаў для паляпшэння становішча рабочых, адмаўляўся уводзіць 8-гадзінны рабочы дзень, падтрымліваў прыватных уладальнікаў, падаўляў усялякія спробы рабочых змагацца за свае правы.

Ва ўмовах фактычна ўстанавіўшыхся ў краіне дэмакратычных свабод прафесійныя саюзы станавіліся рэальнай сілай абароны правоў рабочых.У сакавіку-красавіку былі створаны прафсаюзы рабочых шчацiннікаў і шчотачнікаў, будаўнічых рабочых, рабочых па апрацоўцы скур, трамвайных рабочых, металістаў, хатняй і рэстараннай прыслугі, фабрыкі "Дзвіна", ігольнага цэха, цырульнікаў, гандлёва-прамысловых служачых, рабочых і развозчыкаў піўных і мінеральных вод, фармацэўтаў, ніжэйшых служачых урадавых, грамадскіх і прыватных устаноў, служачых губернскіх земстваў. Аднавіў сваю работу адзін са старэйшых прафсаюзаў (дзейнічаў з 1906 г.) работнікаў друкарскай справы [4, 31 мая]. Як бачна прафсаюзы ствараліся па вузкапрафесіяняльнаму прынцыпу, былі колькасна невялікімі, ад некалькіх дзесяткаў да некалькіх соцен чалавек, аб'ядноўвалі ад чвэрці да паловы працуючых у галіне. У чэрвені 1917 г. па сведчанні віцебскага павятовага камісара іх налічвалася 20 і аб'ядноўвалі яны больш 7 тыс. чалавек. Найбольш буйнымі былі прафсаюзы гандлёва-прамысловых служачых, 1300 членаў, хатняй і рэстараннай прыслугі – 1200, рабочых па апрацоўцы скур -1100 [1, 102; 2,21 июня].

20 красавіка для каардынацыі дзейнасці асобных прафсаюзаў і прадстаўніцтва іх агульных інтарэсаў арганізацыйна аформілася Цэнтральнае Бюро прафсаюзаў Віцебска. На аб'яднаным пасяджэнні праўленняў усіх арганізаваных у Віцебску прафсаюзаў быў зацверджаны статут гэтага органа. Цэнтральнае Бюро узяло на сябе функцыі прадстаюляць агульныя, палітычныя і эканамічныя інтарэсы прафсаюзаў перад грамадскімі і заканадаўчымі ўстановамі. Як установа, якая валодала правамі юрыдычнай асобы, ЦБ магло аб'яўляць аб пачатку і завяршэнні забастовак, арганізоўваць стачачны фонд, фонд на выпадак беспрацоўя, кааператывы, крэдытныя і спажывецкія таварыствы і г.д. Яго фінансавыя сродкі складаліся з 10% адлічэнняў ад уступных членскіх узносаў, чыстага даходу ад прадпрыемстваў асобных прафсаюзаў, ахвяраванняў [4,25 мая]. У склад Цэнтральнага бюро ўвайшло па 2 прадстаўнікі ад праўленняў прафсаюзаў, а таксама 3 прадстаўнікі ад Выканкома Савета Рабочых Дэпутатаў і па 1 прадстаўніку ад сацыялістычных партый [4, 20 мая]. Такі прынцып фарміравання Цэнтральнага бюро выявіў адзінства рабочага і рэвалюцыйнага руху, сувязь рэвалюцыйных партый з прафсаюзным рухам.

25 красавіка адбылося першае пасяджэнне Цэнтральнага бюро, на якім быў выбраны прэзідыўм. Старшынёй стаў Г.Я. Арансан, прыкметная асоба ў рэвалюцыйным Віцебску, які адначасова ўзначальваў Віцебскі Савет рабочых дэпутатаў і арганізацыю Бунда. Цэнтральнае Бюро размяшчалася па Вакзальнай вуліцы.



Репозиторий ВГУ

Стварэнне агульнагарадскога кіруючага органа актывізавала дзейнасць галіновых прафсаюзаў. Ствараліся бальнічныя касы, абмяркоўваліся праекты страхавання рабочых ад беспрацоўя, сацыяльна-эканамічнае становішча ў горадзе, ішоў пошук шляхоў вырашэння наспеўшых праблем. Так, 20 красавіка і 4 мая адбыліся нарады праўленняў прафсаюзаў, Выканаўчага камітэта Савета рабочых дэпутатаў, прадстаўнікоў Савета салдацкіх дэпутатаў і дэлегатаў сацыялістычных партый, прысвечаныя формам эканамічнай барацьбы ў Віцебску. На іх было прызнана цяжкае становішча рабочых, выкліканае вайной і разрухай, выпрацаваны меры барацьбы з беспрацоўем: увядзенне 8-гадзіннага рабочага дня, арганізацыя грамадскіх работ, забеспячэнне харчаваннем беспрацоўных , арганізацыя бірж працы [4, 20 мая].

Прафсаюзы фарміравалі і прад'яўлялі канкрэтныя патрабаванні да ўладальнікаў прадпрыемстваў. Сярод якіх: устанаўленне 8-гадзіннага рабочага дня, стварэнне спрыяльных умоў працы, павышэнне заработнай платы, недапушчэнне звышурочных работ і прыёму на работу асоб маладзей 16 год, штотыднёвая аплата працы. Актыўня пазіцыя прафсаюзаў спрыяла таму, што гэтыя патрабаванні часта задавальняліся мірным шляхам, як гэта было на фармацэўтычных і шчотачных прадпрыемствах, у парыкмахерскіх і булачных [4, 26, 31 мая].

Аднак не заўсёды мірным шляхам удавалася дабіцца сваіх патрабаванняў рабочым. У чэрвені адбыліся стачкі панчошніц і краўцоў прафсаюза ігольнага цэха [4, 7 июня]. Для дапамогі бастуючым Цэнтральнае Бюро выдзеліла 300 руб., бо ў панчошніц адсутнічалі сродкі каб працягваць забастоўку. А вось двухтыднёвая забастоўка краўцоў завяршылася поўнай перамогай.

Нарастанне стачачнай барацьбы, процістаянне пад час забастовак прыносілі страты абодвум бакам, таму прафсаюзы, якія кіраваліся сацыял-дэмакратычнымі партыямі, шукалі мірных шляхоў вырашэння складаных праблем сацыяльных адносін. 3 мая 1917 г. у Віцебску адбылося аб'яднанае пасяджэнне праўленняў прафесійных саюзаў, на якім пасля абмеркавання быў прыняты праект заснавання прымірыцельных камер для вырашэння канфліктаў, якія ўзнікалі паміж рабочымі і прадпрымальнікамі. Аналагічныя прымірыцельныя камеры былі створаны і ў іншых гарадах Віцебскай губерні.

Цэнтральнае Бюро прафсюаюзаў распрацавала статут прымірыцельных камер, які быў зацверджаны агульным сходам праўленняў усіх саюзаў. Згодна са статутам прымірыцельныя камеры ствараліся пры прафсаюзах і іх секцыях, пры буйных прамысловых прадпрыемствах для садзейнічання рабочым і прадпрымальнікам у вырашэнні канфлікта шляхам узаемнага пагаднення. Іх рашэнне было абавязковым для спрачаючыхся бакоў. У склад гэтых камер павінна было ўваходзіць не менш чым па 2 прадстаўнікі ад рабочых і гаспадароў. Для выпрацоўкі пагаднення агульнага характару паміж прадпрымальнікамі і рабочымі Віцебска, для вырашэння асабліва складаных спрэчак, якія не маглі вырашыць заводскія прымірыцельныя камеры, стваралася Цэнтральная прымірыцельная камера [4, 26 мая].

На пасяджэнні Цэнтральнага Бюро прафсаюзаў Віцебска 17 мая былі праведзены выбары ад рабочых у Цэнтральную прымірыцельную камеру. Былі выбраны 4 члены і 4 кандыдаты: Рыўкін, Х. Селюцін, З. Гурэвіч, Шумелішскі, Діпольт, Б.Х. Гінзбург, Ваўчок і Бароўскі [4, 20 мая].

На 15 чэрвеня прымірыцельныя камеры былі адкрыты пры наступных прадпрыемствах і прафсаюзах: фабрыцы "Дзвіна", акцыянернае таварыства "Віцебскі трамвай", саюзе ігольнага цэха, гандлёва-прамысловых служачых, металістаў, хатняй і рэстараннай прыслугі. Так пачалі стварацца органы для разбору працоўных канфліктаў і спрэчак.



Репозиторий ВГУ

Аднак, калі ў красавіку-маі 1917 г. рабочы рух яшчх не насіў масавага характару, забастоўкі адбываліся толькі на асобных прадпрыемствах, то ў чэрвені-ліпені стачачны рух набыў масавы характар. Патрабаванні рабочых насілі пераважна эканамічны характар.

5 чэрвеня прафсаюз "Ігла" прыняў рашэнне арганізаваць забастоўку на фабрыцы Мастовіча і Фінкельштэйна, а таксама стачку шапачнікаў [4, 10 июня]. Да 16 чэрвеня патрабаванні краўцоў фабрыкі Мастовіча былі задаволены, акрамя аплаты за дні забастоўкі. А патрабаванні шапачнікоў былі задаволены поўнасцю [4, 16 июня]. 13 чэрвеня была аб'яўлена забастоўка ва ўсіх абутковых майстэрнях горада з патрабаваннямі павышэння заработнай платы [4, 15 июня]. З 16 па 22 чэрвеня адбылася паўторная забастоўка прачачанікаў і фарбавальшчыкаў, бо патрабаванні першай забастоўкі былі задаволены толькі на паперы. Становішча іх было непараўнальна цяжкім. Працавалі ў падвальных памяшканнях, дзе адсутнічала вентыляцыя, з высокай вільготнасцю і насычанасцю шкоднымі парамі фарбаў і хімікатаў. Гэта ніяк не ўлічвалася пры аплаце працы. Яна наадварот была адной з нізкіх у горадзе. Прафсаюз сфарміраваў цэлы пакет патрабаванняў: павышэнне зарплаты, устанаўленне 8-гадзіннага рабочага дня, звальненне рабочых толькі са згоды саюза, аплата прастояў, святочных дзён і дзён забастоўкі [4, 7 июня].

З аналагічнымі патрабаваннямі баставалі рабочыя табачнай фабрыкі Калбаноўскага [4, 17 июня], рабочыя і служачыя "Віцебскага трамвая" [4, 26 июня], пераплётчыкі [4, 29 июня], прафсаюз шчацінnікаў і шчотачнікаў [4, 20 июня], рабочыя фабрык "Энергас" і "Дзвіна", шчацінна-шчотачных майстэрняў, рабочыя гарадскога вадаправода [5, 12 июля], рабочыя параходства Гіндзіна і г.д. На працягу месяца баставалі работнікі хатняй і рэстараннай прыслугі, шчаціннікіна фабрыках Сабалевіча і Трубека [5, 13 июля). Усяго за два летнія месяцы, чэрвень-ліпень, забастоўкі прайшлі, па няпоўных дадзеных, больш чым на 20 прадпрыемствах горада, а на некаторых з іх двойчы. Не спыніліся забастоўкі і ўканцы лета – восенню 1917 г.

У сувязі з узмацніўшайся эканамічнай барацьбой у горадзе 5 ліпеня адбылася канферэнцыя прафсаюзаў, якая абмеркавала склаўшаеся становішча. Пры некаторых адрозненнях патрабаванняў бастуючых, усе яны мелі адно агульнае – павышэнне заработнай платы, ад 30% да 80% [5, 6 июля]. А павышэнне зарплаты цягнула за сабой рост цэн, падхлёставала інфляцыю, якая і так раскручвалася ва ўмовах эканамічнага крызісу. Так, патрабаванні рабочых і служачых акцыянерных таварыстваў "Віцебскага трамвая" і вадаправода павышэння заработнай платы адразу паставілі пытанне перад гарадской Думай пытанне аб павышэнні тарыфаў на электрычнасць, водазабеспячэнне і праезд у трамваі. На што Дума не жадала ісці [1, 203]. Рост цэнзводзіў на ніштозаваяванаеваўпартай і цяжкайстачачнайбарацьбе.

Не апраўдалі надзей на вырашэнне працоўных спрэчак паміж прадпрымальнікамі і рабочымі прымірыцельныя камеры. Пры такіх накале і колькасці канфліктаў летам 1917 г. вядомы толькі два выпадкі ўдзелу прымірыцельных камер у вырашэнні працоўных спрэчак. Гэта ўдзел прымірыцельнай камеры пры прафсаюзе металістаў у вырашэнні канфлікта паміж рабочымі завода Грынберга і яго ўладальнікам, а таксама дзейнасць Цэнтральнай прымірыцельнай камеры па ўладжванню канфлікта паміж рабочымі і адміністрацыяй акцыянернага таварыства "Віцебскі трамвай" у ліпені 1917 г. [3, 17; 5, 1 августа]. Думаецца, што адсутнасць прававой базы, культуры працоўных спрэчак, умовы рэвалюцыі не дазволілі новай і арыгінальнай форме сацыяльнага партнёрства рэалізавацца ў поўнай меры.



Рэпазіторый ВДУ

У ходе стачачнай барацьбы рабочыя пераходзілі да ўстанаўлення кантролю над прадпрыемствамі. Так, у ліпені на заводзе сельскагаспадарчых прылад А.Берліна быў выбраны заводскі камітэт. Рабочыя завода поўнасцю падпарадкаваліся рашэнням заводскага камітэта і перадавалі яму ўсе скаргі і заявы. Без рашэння камітэта адміністрацыя завода не мела права наймаць і звальняць работнікаў [5, 30 июля].

Фабрычны камітэт фабрыкі "Дзвіна", дзе працавала 1400 чалавек, устанавіў кантроль над адміністрацыяй па пытанні працы дзяцей [5, 5 августа].

У канцы ліпеня 1917 г. адбыліся змены ў кіруючым органе прафсаюзаў Віцебска. Цэнтральнае Бюро было перайменавана ў Цэнтральны Савет. Стары прэзідыўм адмовіўся працаваць і адкрытым галасаваннем выбраны новы яго склад. Старшынёй застаўся Г.Я. Арансан, сакратаром Э.Ц этлін [5, 2 августа].

Рэвалюцыйныя падзеі кастрычніка 1917 г. змянілі растаноўку палітычных сіл у прафсаюзах. Лідэры сацыялістычных партый адмоўна ўспрынялі Кастрычніцкую рэвалюцыю ў Петраградзе. Таму пасля ўзяцця бальшавікамі ўлады ў Віцебску адбыліся перавыбары як Саветаў, так і прафсаюзаў. У выніку палітычную перавагу ў прафсаюзах атрымалі бальшавікі.

**Крыніцы і літаратура**


1. Документы и материалы по истории Белоруссии / Ин-т истории АН БССР; под ред. В. Н. Перцев. – Минск : АН БССР, 1954. -Т.IV. – 515 с.
2. Витебский листок. – 1917.
3. Профсоюзное движение на Витебщине: история, опыт, уроки / ред., И.В. Мандрик, В.Г. Стаценко, В.М. Шорец. – Витебск, 2000. – 102 с.
4. Известий Витебского Совета солдатских и рабочих депутатов.– 1917.
5. Известия Витебских Советов Крестьянских, Солдатских и Рабочих Депутатов.– 1917.


## ПОВСЕДНЕВНАЯ ЖИЗНЬ МОСКОВСКОГО КРЕМЛЯ В ПЕРИОД ОКТЯБРЬСКИХ БОЁВ 1917 ГОДА (ПО ДНЕВНИКАМ Ю.В. АРСЕНЬЕВА)


***Н.К. Миско, А.И. Свинаренко***

*Москва, Исторический музей*


В фонде 43 ОПИ ГИМ [1], среди прочих документов Арсеньевых – представителей древнейшего дворянского рода России – хранятся дневники Юрия Васильевича Арсеньева – историка, профессора Московского Археологического Института, специалиста по геральдике и генеалогии, действительного статского советника, участника Русско-Турецкой войны 1877-1878 гг., который был хранителем Оружейной палаты с 1898 г. до своей смерти в феврале 1919 г. Дневники охватывают период с 1 января 1914 г. по 11 августа 1918 г. В нашем докладе мы рассмотрим, какой предстаёт повседневная жизнь кремлёвских обывателей в период октябрьских боёв в дневниках одного из непосредственных свидетелей этих событий. Временные рамки работы – канун октябрьского переворота в Петрограде (24 октября), заканчиваем же рассмотрение дневников первой неделей ноября, когда в Москве окончательно победили большевики и когда только-только начинается процесс осознания произошедшего и новой реальности, в которой теперь приходится существовать жителям Москвы. Все даты даются по старому стилю.

Будучи хранителем Оружейной палаты, Арсеньев занимал служебную квартиру в Кремле на Дворцовой улице, идущей вдоль западной стены Кремля, в одном из Ка-



Репозиторий ВГУ